Аддзел адукацыі, спорта і турызма Рагачоўскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яслі-сад № 5 г. Рагачова”

# СЮЖЭТНА-ГУЛЬНЯВЫ КОМПЛЕКС

## ТЭМА “У ГОСЦІ ДА БАБУЛІ”

(2 МАЛОДШАЯ ГРУПА)

Укладальнік:

Зайцава Алена Мікалаеўна,

выхавацель дашкольнай адукацыі

Рагачоў

2016

## Сюжэтна-гульнявы комплекс "У госці да бабулі"

## (другая малодшая група)

**Мэта:** развіваць цікавасць да гульні з цацкамі (масажнымі мячыкамі), маўленчую і рухальную актыўнасць у час гульнявой дзейнасці; фаміраваць уяўленні пра дзікіх жывёл (вожык), уменне вызначаць характэрныя прыкметы; выхоўваць цікавасць да мастацкага слова.

**Матэрыял і абсталяванне:** атрыбуты да вобраза Бабулі, цацка Вожык, кошык, мячыкі масажныя (па колькасці дзяцей), бел. забаўлянкі “Ладу, ладкі”, “Вожык”.

### Ход гульні.

*Арганізацыйны момант*

Дзеці ўваходзяць у групу. Іх сустракае выхавальнік.

Выхавальнік: «Дзеткі, паглядзіце, хто вас чакае».

Дзеці: «Алена Мікалаеўна».

Выхавальнік: «Так. Але я зараз пераўтваруся... (апранае хустку і падвязвае фартух) у бабульку. Давайце прывітаемся» *(дзеці вітаюцца).*

*Асноўная частка*

Бабулька: «Добры дзень, мае даражэнькія. Я сення буду размаўляць на беларускай мове. На якой мове будзем размаўляць? (адказы дзяцей) У каго з вас ёсць таксама бабуля? Як яе зваць? (адказы дзяцей) Бабулі вас заўсёды чакаюць, шмат прысмакаў гатуюць. А што нашы дзеткі любяць есці? Так, кашку з малачком. Раскажыце мне, як вы частуецеся кашкай.

***Ладу, ладу, ладкі*** (забаўлянка)

| Тэкст | Рухі |
|---|---|
| Ладу, ладу, ладкі,<br>— Дзе былі?<br>— У бабкі. | Хлапкі ў далоні |

| | |
|---|---|
| — А што елі?<br><br>— Кашку. | Паказаць, як лыжкай ядзім |
| — А што пілі?<br><br>— Малачко. | Паказаць, як п'ём з кубачка |
| — Папілі, паелі<br><br>— І — шу, паляцелі | Памахаць рукамі, як "крыльцамі" |

Бабуля: "Я да вас прыйшла не адна. Нас чакае госць. Пойдзем, дзеткі, паглядзім». (Выхавальнік звяртае ўвагу дзяцей на вожыка, які сядзіць на падлозе).

Бабуля: «Хто гэта нас чакае? Так, яго завуць вожык. Паўтары, калі ласка, ...Вадзім (некалькі дзяцей). Давайце, павітаемся з вожыкам. Добры дзень, вожык!.. Разгледзце вожыка, які ён? Што ёсць у вожыка? Якія часткі цела? (адказы дзяцей) Вожык хоча з вамі пагуляць. Згодны? Я буду вожыкам, а вы — мышкамі. Вазьміце медальёнчыкі мышанят (Гульня раней развучана з дзецьмі.)

***«Вожык і мышы»***

*Месца правядзення:* памяшканне группы.

*Абсталяванне:* медальёнчыкі мышак.

*Мэта:* развіваць хуткасць, спрыт, вынослівасць, рашучасць.

*Апісанне гульні:* выбіраецца «вожык» (ці выхавацель), астатнія становяцца ў кола, «вожык» — у цэнтры. Дзеці водзяць карагод вакол «вожыка» і разам з выхавальннікам імкнуцца прагаворваць словы:

| Тэкст | Рухі |
|---|---|
| Бяжыць вожык, тупу-туп!<br><br>Сам калючы, востры зуб! | Хада па крузе |

| | |
|---|---|
| - Вожык, вожык, ты куды?<br><br>Ад якой бяжыш бяды? | Спыняюцца і пытаюцца у вожыка |
| Вожык ножкамі туп-туп!<br><br>Вожык вочкамі луп-луп! | Тапочуць нагамі Хлопаюць рукамі |
| Навакол пануе ціш,<br><br>Вожык чуе ў лісцях мыш | Падносяць пальчык да роціка, каб імітаваць "ціш" |
| Ён да лісця тапу-тап!<br><br>І лапкаю мышку цап! | Разбягаюцца, вожык даганяе |

Бабуля: «Якія вы лоўкія і спрытныя. Нікога не дагнаў «вожык». Малайцы.

Раздам я вам вось такіх „вожыкаў"».

Выхавальнік раздае мячыкі.

*Заключная частка*

Практыкаванне з масажнымі мячамі.

| Тэкст | Рухі |
|---|---|
| У далонькі вожыкаў узялі<br><br>І хуценька пакаталі,<br><br>Па далонькам павадзілі, павадзілі, | Масаж далоней |
| Угару падкінулі і схапілі | Падкінуць і схапіць |

Бабуля: «Малайцы, дзеткі. Усе схапілі мячыкі. Кладзіце іх у кошык. Мы з вамі потым яшчэ пагуляем з імі. А зараз я і вожык з вамі развітаемся - да пабачэння! (дзеці паўтараюць за выхавацелем) Выхавацель знімае хустку і фартух.

А сейчас мы продолжим наши игры на ковре.

Літаратура:

1. Учебная программа дошкольного образования. – Минск: Министерство образования Республики Беларусь, НМУ «Национальный институт образования», 2012. – 416 с.

Аддзел адукацыі, спорта і турызма Рагачоўскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яслі-сад № 5 г. Рагачова”

# СЮЖЭТНА – ГУЛЬНЯВЫ КОМПЛЕКС
# «АД РАННЯ ДА ЗМЯРКАННЯ»
# (СЯРЭДНЯЯ ГРУПА)

Укладальнік:
Зайцава Людміла Іванаўна,
выхавацель дашкольнай адукацыі

Рагачоў
2016

## Сюжэтна-гульнявы комплекс «Ад рання да змяркання» (сярэдняя група)

**Мэта:** замацоўваць уяўленні пра паслядоўнасць частак сутак, уменне называць іх. Замацоўваць веданне лічбаў ад 1 да 4.

Садзейнічаць засваенню форм ветлівасці (добрай раніцы, добры дзень, добры вечар, дабранач), адрозненню дзецьмі беларускага і рускага маўлення.

Фарміраваць устойлівую цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, беларускіх народных забаўлянак, твораў беларускіх пісьменнікаў.

**Матэрыял:** цацка Буслік; карціны з выявамі розных частак сутак; мадэль «Суткі»; кругі featureрознага колеру (ружовага, жоўтага, сінягя, чорнага) па колькасці дзяцей; 4 мальберта з лічбай на кожным з іх (ад 1 да 4), бубен; тэкст вершаў, пацешак, загадак.

**Ход.**

1.- Дзеці, у нас сёння госці. Буслік, прывітайся з імі.

Буслік кажа: - Добры вечар.

- Дзеці, правільна Буслік прывітаўся? (Адказы дзяцей.) А чаму трэба казаць «Добрай раніцы»? Якая ў нас зараз частка сутак? (Раніца.) Правільна. Вось мы цябе, Буслік, сёння навучым, калі спаць, калі ўставаць, калі работу пачынаць.

Выхавальнік выстаўляе карціну з выявай раніцы.

- Рабяты, як вы думаеце, якая гэта частка сутак? Чаму? Так, таму што раніцай мы прачынаемся, мыемся, чысцім зубы, апранаемся, ідзем у дзіцячы садок. Што мы робім раніцай у садзе? (Вітаемся з дзецьмі, робім зарадку, снедаем.)

Далей выхавалбнік выстаўляе карціны з выявамі іншых частак сутак (дзень, вечар, ноч). Дзеці называюць іх і расказваюць аб тым, што робяць ў тую ці іншую частку сутак.

- Ну, вось, Буслічак, зразумеў цяпер, калі што трэба рабіць?

- Зразумеў. А вось як трэба вітацца ў розныя часткі сутак?

- Зараз табе дзеці падкажуць. Так, дзеці? (адказы дзяцей: добрай раніцы,добры дзень, добры вечар, дабранач).

2. Рухавая гульня «Дзень – ноч». Па камандзе выхавальніка «Дзень» дзеці ходзяць і бегаюць па групавым пакоі. Па камандзе «Ноч» садзяцца на крэслы. Гульня праводзіцца два разы.

3. Гульня «Калі гэта бывае».

Выхавальнік выстаўляе на мальберт мадэль сутак. (Дадатак №1) Дзеці ўспамінаюць, якi сектар на мадэлі якую частку сутак абазначае.

– Я буду чытаць вам вершы, пацешкі, загадкі пра розныя часткі сутак. А вы павінны зразумець, аб якой частцы сутак ідзе размова і адлюстраваць гэта на мадэлі сутак. (Дзеці выконваюць заданне.) (Дадатак №2)

4. Гульня «Суткі». У групавым пакоі размешчаны чатыры мальберта. На кожным з іх лічба (ад 1 да 4). Дзеці па заданню выхавальніка расстаўляюць карціны з выявамі частак сутак на мальберты з лічбамі (1 – раніца, 2 – дзень, 3 – вечар, 4 – ноч). Выхавацель раздае дзецям мадэлі частак сутак (кругі рознага колеру - па аднаму на кожнага дзіцяці: ружовы – раніца, жоўты – дзень, блакітны – вечар, чорны – ноч). Дзеці па камандзе выхавальніка ходзяць па пакоі. На каманду «Знадзі сваю частку сутак» падыходзяць да карціны з выявай той частцы сутак, круг якога колеру у іх у руцэ. Потым дзеці мяняюцца кругамі і гульня пачынаецца зноў (2-3 разы).

- Двайце падлічым, колькі ў сутках частак. (Дзеці лічаць карцінкі з выявамі частак сутак, якія стаяць на мальбертах.) Так, у сутках чатыры часткі. Назавіце іх яшчэ раз. (Дзеці называюць: раніца, дзень вечар, ноч.)

Буслік дзякуе дзецям за дапамогу.

**Літаратура.**

1. Учебная программа дошкольного образования. - Минск : Нац. Ин-т образования, 2012. – 416 с.

2. Житко, И.В. Формирование элементарных математических представлений у детей от 4 до 5 лет : учеб.-метод. пособие для педагогов учреждений дошкольного образования с белорус. и рус. яз. обучения / И.В. Житко. – Минск : Нац. ин-т образования, 2014. – 200 с.

3. Читаем детям : хрестоматия : пособие для педагогов учреждений дошк. образования. В 3 т. Т. 2. От 3 до 5 лет / сост. А.И. Саченко, Л.А. Смаль. – Минск : Экоперспектива, 2015. – 415 с.

**Дадатак№1. Мадэль сутак**



**Дадатак №2. Вершы, пацешкі, загадкі аб частках сутак.**

Вось і людзі спяць,
Вось і птушкі спяць,
Зайкі спяць на травачцы,
Качкі на муравачцы,
Дзетачкі ў ложачкахЭ
Спяць ды спяць,
Цэлы свет, як сонны сад.

Над лугамі, ў зару
Пастушок: «Ту-ру-ру-ру!»
А кароўкі ў лад яму
Зацягнулі: «Му-му-му!»

Коцік прачынаецца –
Лапкамі ўмываецца.
Кветка прачынаецца –
Росамі ўмываецца.
Ну, а мы з сястрычкаю
Мыемся вадзічкаю.

Я аладачкі з пяску
Сёння цэлы дзень пяку,
Але мой рахманы кот
Не бярэ аладкі ў рот.

Спіць рака,
Заснулі рыбкі і бабры.
Спіць зялёная бярозка на двары.

Я абед варыць вучуся,
Працаваць я не лянюся.
І, калі частуе мама,
Памагаю ёй таксама.

Ноч настала. Селі гусі
Ля ракі адпачываць.
Лялькі спяць твае, Маруся,
І табе пара ўжо спаць.

Раз, два, тры,
Чатыры, пяць…
Васілёк кладзецца спаць.

З вечара да раніцы,
Губляючы сляды,
Па лесе воўк бадзяецца
У пошуках яды.

Пчолка цэлы дзень улетку
З кветкі лётала на кветку
Для таго, каб цэлы год
Нашы дзеці елі мёд.

Вечар сіняю хусцінкай
Наваколле ахінуў.
Калыханкай салаўінай
Паланіў ён цішыню.

Цёмнай ночкай павучыха
Павучка люляла ціха.

Я сёння рана-рана ўстаў,
Старанна ложак свой заслаў,
Памыўся я, наеўся ўсмак…
І кожны раз раблю я так.

Над ракой зара ўстае,
На двары певень пяе,
Мыюцца кацяты,
Прачынаюцца рабяты.

Аддзел адукацыі, спорта і турызма Рагачоўскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яслі-сад № 5 г. Рагачова”

# ЗАНЯТАК ПА АДУКАЦЫЙНАЙ ВОБЛАСЦІ “РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН”

## ТЭМА. У КРАМУ ЗВ АГАРОДНІНАЙ ДЛЯ САЛАТЫ. СКЛАДАННЕ АПІСАЛЬНАГА АПАВЯДАННЯ “САЛАТА З АГАРОДНІНЫ” (СТАРШАЯ ГРУПА)

Укладальнік:
Лугоўская Алла Яўгеньеўна,
выхавацель дашкольнай адукацыі

Рагачоў
2016

## Занятак па адукацыйнай вобласці
## “Развіццё маўлення і культуры маўленчых зносін” (старшая група)

**Тэма:** «У краму за агароднінай для салаты». (Складанне апісальнага апавядання «Салата з агародніны»)

**Праграмныя задачы:** развіваць навыкі разумення беларускай мовы ў дзяцей, стымуляваць уменне складаць апісальнае апавяданне па задуме; узбагачаць беларускі слоўнік назвамі агародніны, навакольных аб’ектаў (крама); утвараць назвы агародніны са значэннем адзінкавасці (бульба – бульбіна, цыбуля – цыбуліна і інш); удасканальваць правільнае вымаўленне гукаў [дж], [дз] у словах; выхоўваць устойлівую цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, жаданне ёй авалодаць.

**Слоўнікавая работа:** крама, бульба – бульбіна, цыбуля – цыбуліна, морква – морквіна, фасоль – фасоліна, гарох – гарошына, бурак, агурок, часнок, агародніна.

**Абсталяванне:** лялька «Бульбашык»; карта паслядоўнасці прыгатавання салата; кошык з агароднінай, карткі з малюнкамі (агародніна, цёрка, нож, каструля, алей, соль, смятана, маянэз, блюда, салатнік), скрынка, пісьмо, мальберты.

**Ход.** У групу заходзяць дзеці, вітаюцца з гасцямі.

– А куды гэта дзеўся Бульбашык, скрыначка яго ёсць, а яго няма. Калі мы нагадалі Бульбашыка і яго скрыначку, дык на якой мове мы будзем размаўляць? (на беларускай). Тут нейкае пісьмо, давайце пачытаем: «Я паехаў у краму за агародінай. Бульбашык.».

– Хто ведае, куды паехаў Бульбашык? (адказы дзяцей)

– Крама па-беларуску, а “магазин” па-руску. Дык куды паехаў Бульбашык? (у краму). Зараз мы з вамі паедзем яго сустракаць. Спачатку лічылкай выбярэм таго, хто будзе шаферам: Кацілася торба з высокага горба,
А ў той торбе хлеб, пшаніца,
З кім жадаеш ты дзяліцца?

Дзеці садзяцца ў «машыну». Выхавацель вядзе размову з децьмі.

– Як вы мяркуеце, чаму Бульбашык за агароднінай паехаў у краму? Ці ёсць зараз агародніна ў полі, на агародзе? (Не, таму, што зараз зіма). Што патрэбна, каб агародніна расла? (сонца, цяпло, дождж). Калі зямля ад спякоты сохла, як людзі раней запрашалі дождж?

Пры прагаворванні заклічкі: Дожджык, дожджык, палівай!
Будзе добры ўраджай! (2 разы), - звяртаць увагу на вымаўленне гука “дж”, “дз”.

– А яшчэ людзям трэба было добра папрацаваць, каб вырасціць багаты ўраджай. Давайце нагадаем з вамі прыказкі пра працу:

Без працы няма чаго хлеба шукаці.

Рана ўстанеш – багата зробіш.

Не вырасціш яблынькі не з’ясі яблыка.

Дзе гультай ходзіць, там зямля не родзіць.

– Вось і прыехалі! Куды мы прыехалі? (у краму). Тут і Бульбашык, і яго кошык. (Выхавацель бярэ кошык у рукі).

– Што купіў Бульбашык у краме? (агародніну)

–Давайце разгледзім агародніну і паспрабуем утварыць назву так, каб размова шла пра адну штуку.

Дзеці ўтвараюць патрэбныя назвы: бульба – бульбіна, цыбуля – цыбуліна, морква – морквіна, фасоль – фасоліна, гарох – гарошына.

– А зараз паедзем у дзіцячы садок. (Сядаюць у “машыну”).

– Якое новае слова сёння мы пакладзем у сваю скрыначку? (крама)

– Вось ужо і прыехалі. Сення будзем рабіць салаты, а якія - мы яшчэ не вырашылі. Вам трэба будзе прыдумаць салату, даць яму назву і з картак выкласці паслядоўнасць прыгатавання салату.

Выхавацель звяртае ўвагу дзяцей на карту паслядоўнасці прыгатавання салаты: трэба выбраць агародніну, калі яе патрэбна зварыць – бяром каструлю. Далей трэба вырашыць, чым жа будзем крышыць агародніну: нажом ці цёркай. Потым, каб салата была смачнай – чым трэба запраўіць: смятанай, маянэзам ці алеям. Калі трэба – дабаўляем соль і прыгожа выкладаем у салатнік або блюда.

– Паслухайце якую салату я рабіла ўчора: “Сваю салату я назвала «Восеньская». Для салату я ўзяла моркву, бурак, капусту. Бурак зварыла. Капусту мелка пакрышыла нажом, а моркву і бурак пацерла на церцы. Пасаліла і заправіла алеям. Усе выклала ў глыбокі салатнік і ўпрыгожыла” (Пры расказе выхавацель паказвае указкай на ўсе прадметы, якія патрэбны для прыгатавання салаты).

Дзеці дзеляцца на 3 групы (па 5-6 чалавек), якія, працуючы з карткамі, прыдумваюць сваю салату. Потым адзін удзельнік з кожнай групы раскажа, як прыгатаваць салату з дапамогай картак.

Дзецям даецца час для сумеснага складання апавядання “Салата з агародніны”. Па чарзе адзін ад сваёй групы выходзіць са сваёй тэхналагічнай карткай і расказвае ўсім рэцэпт прыгатавання салату.

Падводзіцца вынік: Бульбашыку спадабалася ў гасцях. Усе рэцэпты прыгатавання салатаў ён запомніў і дома паспрабуе сам прыгатаваць.

Агародніну дзеці перадаюць на кухню, каб кухары яе сварылі. У другой палове дня ўсе разам будуць гатаваць з агародніны вінегрэт.

**Літаратура.**

1. Учебная программа дошкольного образования. – Минск: Министерство образования Республики Беларусь, НМУ «Национальный институт образования», 2012. – 416 с.